# ВАЕННА-ГІСТАРЫЧНАЯ ТЭМА Ў РАМАНЕ БАГУМІЛА ГРАБАЛА “Я АБСЛУГОЎВАЎ АНГЕЛЬСКАГА КАРАЛЯ”

**Вострыкава А.У.**

***Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт***

***Анатацыя:*** ваенна-гістарычная тэма ў самым вядомым рамане Грабала падаецца праз прызму экзістэнцыяльнай праблематыкі.

***Ключавыя словы:*** чэшская літаратура XX стагоддзя, Б.Грабал, раман “Я абслугоўваў ангельскага караля”, ваенна-гістарычная тэма.

Раман “Я абслугоўваў ангельскага караля” (1971) з’яўляецца самым знакамітым раманам чэшскага пісьменніка XX стагоддзя Багуміла Грабала. Гэты раман апісвае жыццёвыя варункі афіцыянта і гатэльера Яна Дзіце на фоне значных палітычных падзей Чэхаславакіі. Сам герой твора, з аднаго боку, можа быць успрыняты як тып “маленькага чалавека”, добра знаёмы па літаратуры XIX стагоддзя, з другога боку, – гэта пікара, плут, махляр і авантурыст, які прабіўся з самых нізоў у мільянэры. А сам раман мае характэрныя элементы плутаўскога альбо пікарэскнага раману, які быў папулярны ў еўрапейскай літаратуры XVIII стагоддзя. У той жа момант твор – відавочна мастацкае параджэнне XX стагоддзя, паколькі значнае месца ў рамане займаюць экзістэнцыяльныя тэмы і матывы. Ды і сама манера аповеду набліжаецца да манеры “плыні свядомасці” і, па сутнасці, уяўляе сабой унутраныя маналогі, аповед афіцыянта з дзіўным прозвішчам Дзяце (дарэчы, ён сапраўды вельмі маленькага росту, што абумовіла многія перыпетыі ягонага жыцця). Твор самім Грабалам у падзагалоўку быў пазначаны як “апавяданні” і мае ў сваёй кампазіцыі пяць глаў: “Келіх грэнадзіны”, “Гатэль “Ціхота”, “Я абслугоўваў ангельскага караля”, “А галавы я так і не знайшоў”, “Як я зрабіўся мільянэрам”. Аўтар гаворыць пра аўтаматычны метад узнікнення тэксту і кожная глава пачынаецца словамі:

“Ну то слухайце, што я вам цяперака раскажу”, а заканчваецца: “Ну што, досыць вам? На гэтым сёння ўсё”.

Гісторыя апавядальніка адбываецца на працягу 1920-1950-х гг. у Чэхаславакіі. Малы пікара паступае на вучэнне ў рэстанан пры гатэлі і пазнае вялікі акаляючы яго свет наведвальнікаў гатэля, гандлёвых агентаў і дзяўчат па выкліку. У другой частцы рамана ён успамінае свае прыгоды і службу ў эксклюзіўным гатэлі для выбранаых, прэзедэнтаў, генералаў і паэтаў. Трэцяя глава распавядае нам пра працу Дзяце ў гатэлі “Парыж”. Кульмінацыяй аповеду становіцца апісанне вячэры эфіёпскага караля, ад якога ён атрымлівае за сваю працу ордэн. Пазней, за свае стасункі з нямецкай настаўніцай Лізай, яго выганяюць з гатэля. У чацвёртай частцы Грабал звяртаецца да таго перыяду жыцця свайго героя, калі той быў вымушаны працаваць у нямецкіх гасцініцах і рэстаранах, у якіх ён адчуваў сябе толькі слугой. Павагі ў нацыстаў яму не дае ні падцверджанне свайго арыйскага паходжання, ні жаніцьба на немцы Лізе, якая пасля нараджэння сына адразу ад’язджае на фронт медыцынскай сястрой. Жыццё складзецца так, што памылкова Дзіце будзе схоплены гестапа, Ліза загіне пры налёце авіяцыі. Апошняя глава распавядае нам, як былы афіцыянт за каштоўныя паштовыя маркі, якія Ліза нарабавала ў забітых габрэяў на Усходнім фронце, купіць сабе гатэль і заробіць мільён. Аднак астатнія чэшскія гатэльеры не прымуць парвеню ў сваю кампанію, нават пасля камуністычнага перавароту 1948 г., калі ўсе багацці будуць канфіскаваны і Дзяце апынецца разам з іншымі мільянэрамі ў зняволенні. Раман сканчваееца тым, што герой у самоце працуе на будоўлі дарогі ў памежных раёнах, успамінае былое жыццё і запісвае свае ўспаміны.

Галоўны герой рамана не ацэньвае ні сваё жыццё. ні свае ўчынкі, ні палітычную сітуацыю ў краіне, але перад намі праходзіць яго станаўленне ад самага дзяцінства, калі яго выхоўвала бабуля, да таго моманту, калі ён жыве ў лесе, без людзей, бачыць толькі свайго коніка, казу, ваўкарэза і

дзікую котку і становіцца, па сутнасці, пісьменнікам, прайшоўшы на прымусовых працах школу выхавання і адукацыі ў прафесара французкай літаратуры, з якім яго звяло жыццё. Дзіця паказаны вельмі прадпрымальным і вынаходлівым чалавекам, які па-свойму імкнецца да прыгажосці і эстэтыкі, але свае поспехі і няўдачы сам ён прыпісвае абставінам. Усё жыццё хлопец змагаецца са сваімі фізічнымі і сацыяльнымі комплексамі. Вельмі часта ён адчувае, што людзі ім пагарджаюць, з-за малога росту, з-за таго, што ён пазашлюбнае дзіця, з-за каханя да нямецкай настаўніцы пасля далучэння Судзетаў да Германіі, з-за таго, што ён чэх – немцы ў гады вайны. Аднак, герой ніколі нікому не помсціць, нікога не асуджае, нікога не ненавідзіць. Ён хочыць быць багатым і прафесіяналам у сваёй прафесіі, тужыць па сапраўднаму каханню і жонцы. Жыццё складваецца так, што ён не прызнаны ні як арыец, ні як чэх, ні як мільянэр, ні як бацька (іх з Лізай сын нараджаецца дэбілам, які ўвесь час заняты тым, што забівае цвікі ў падлогу), ні як чэшскі "сокал". Яго самота ў канцы жыцця становіцца татальнай і фактычнай. Але гэтая экзістэнцыяльная лінія не падаецца Грабалам у трагічным ключы, бо галоўнаму герою адзінота дазваляе пазбавіцца прагі багацця і прызнання. Ён спасцігае філасофію быцця, калі горыч і самота выступаюць платай за свабоду і прыгажосць. Мова рамана, якую ўжывае Багуміл Грабал, поўнасцю адлюстроўвае жыццёвую эвалюцыю героя, перыпетыі яго няпростага і цікавага лёсу: апавядальнік (а гэта былы афіцыянт і выхадзец з самых сацыяльных нізоў) культывуе літаратурны стыль, але яго ўнутраны маналог, тая плынь свядомасці, што перад намі, поўная гутарковых пластоў, прафесійнай лексікі і сленгавых выразаў.

Значнае месца ў рамане займае адлюстраванне падзей Другой сусветнай вайны вачамі галоўнага героя. Перш за ўсё паказваецца сітуацыя ў Чэхаславакіі, адносіны да немцаў праз экзістэнцыяльную сітуацыю і пачуцці самога Дзіце. Спачатку ён ходзіць на курсы нямецкай мовы і нямецкія фільмы, чытае нямецкія газеты і спакойна ставіцца да таго, што па

вуліцах Прагі ходзяць студэнты ў белых гольфах і зяленых куртках. Ён застаецца адзіным, хто пагаджаецца адслугоўваць нямецкіх кліентаў пасля далучэння Судзетаў да Германіі, за што яго ўрэшце выганяюць з працы, плюнуўшы яму ў твар у літаратальным сэнсе. Калі немцы акупуюць Чэхаславакію, Ліза становіцца франтавой сястрой, Ян жэніцца з ёй, прайшоўшы ў немцаў медагляд і атрымаўшы дазвол “на апладненне арыйкі”, пачынае працаваць у дзіўным гатэлі, дзе ён абслугоўвае цяжарных немак і “упершыню даўмеўся, што ня трэба мець высокі торс, трэба проста пачувацца высокім, і так я спакойна ацаніў сябе і перастаў быць афіцыянцікам-недамеркам, хлопчыкам з абслугі, якому на радзіме наканавана быць маленькім да канца сваіх дней, адгукацца на звароты “малы” ці “шпэндзік” і чуць дражнілкі з нагоды прозвішча Дзіце, а тут я быў гер Дзітэ, немцы ў гэтым імені ня чулі ніякага “дзіцяці”, …і як мне сказада Ліза, такому імені могуць пазайздросціць прускія й паморскія арыстакраты” [1, с.142-143]. Але паступова хлопец пачынае думаць пра тое, што ў Празе працуюць расстрэльныя каманды, як і ў Брне і іншых чэшскіх гарадах, кожны дзень з’яўляюцца новыя ахвяры, яго суайчыннікі ідуць на смерць, а ён то “ стаіць з прычындаллем у адной руцэ, а другой перабірае на стале парнаграфічныя карцінкі” [1, с.142-149], каб немцы дазволілі ажаніцца з арыйкай, то гуляе вяселле, нібы падпісвае вайсковы пакт пад бюстам Адольфа Гітлера. Для чэхаў ён мае арыйскі душок, а для немцаў – багемскі. Грабал гратэскна апісвае, як Ян і Ліза зачанаюць дзіця пад музыку Вагнера, а пазней называюць свайго пакрыўджанага розумам хлопчыка, як у нямецкай міфалогіі, Зігфрыдам. Пра пералом у вайне і сітуацыю на фронце герой і чытач даведваецца па тварах генералаў і ўсіх тых немцаў, якія прыязджаюць на пабыўку, сустракаюцца з жонкамі і каханымі ў горным гатэлі. Ян, не будучы ні інтэлектуалам, ні проста адукаваным чалавекам, адчувае, што ў яго душы адбываюцца змены: “…я пабачыў сябе дакладна так, як яшчэ сябе ня бачыў – як “сокала”, які ў дзень расстрэлу чэскіх

патрыётаў праходзіў камісію нямецкага доктара на прадмет, ці здатны ён мець палавы кантакт з нямецкай настаўніцай фізкультуры, а калі Нямеччына разьвядала вайну з Расіяй, ажаніўся і сяпваў марш штурмавікоў СА…Я бачыў нават не як мяне вешаюць, а як я сам сябе вешаю на першым жа ліхтары, як я сам сабе даю ў найлепшым выпадку дзесяць гадоў і болей…я, які абслугоўваў імператара Этыёпіі, я асуджаны на праўду..” [1, с.163]. Калі Дзіце хапае гестапа замест другога чалавека, ён рады, што яго зверскі збіваюць на допытах і некалькі тыдняў трымаюць у турэмных засценках. Калі яго называюць “бальшавіцкай свіннёй”, то ён успрымае лаянку як салодкую музыку, бо “я пачынаў разумець – гэта пропуск, зваротны квіток у Прагу, карэктар, вадкасць, якой толькі адной можна змыць тое, ува што я ўляпаўся, калі ажаніўся з немкай, калі стаяў у Хебе перад нацысцкімі дактарамі…” [1, с.175]. Пазней Здэнек, таксама афіцыянт, сябра Дзіце, той, каго павінна было катаваць гестапа замест выпадкова схопленага Яна, стане камуністычным кіраўніком і ўплывовым функцыянерам, ён будзе спрабаваць аказваць падтрымку і ратаваць Дзіце ад канфіскацыі ягонага гатэля, потым турмы і выпраўленчых работ, але галоўны герой ніводнага разу не пагадзіцца на дапамогу. Такім чынам, ваенна-гістарычная тэма падаецца Багумілам Грабалам у рамане праз прызму экзістэнцыяльнай праблематыкі і разуменне падзей галоўным героем, без аўтарскіх ацэнак таго, што адбывалася.

## ЛІТАРАТУРА

1. Грабал, Б. Я абслугоўваў ангельскага караля/ Б.Грабал. Мінск. 2013.— 258 с.